Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 239 (308)
АЎТОРАК
15
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

ПАЧАТАК ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ Ў МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

З вялікай радасцю, палітычнай і вытворчай актыўнасцю сустрэлі працоўныя нашай абласці Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР. Аб надзвычайным уздыме на прадпрыемствах сведчаць публікуемыя сёння ў нашай газеце матэрыялы сходаў і мітынгаў.

З сённешняга дня пачынаецца выбарчая кампанія. Дзень выбараў назначан на 15 снежня. Палітычна-масавая работа вакол Указа аб дні выбараў павінна быць разгорнута ва ўсю шырыню.

Вопыт работы, набыты ў час выбарчай кампаніі ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР, павінен быць шырока цяпер выкарыстаны.

Прыцягненне шырокага актыва для работы ў выбарчых камісіях, на выбарчых участках сярод насельніцтва горада і вёскі, арганізаваная работа партыйных, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый забяспечылі выдатную перамогу блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных па сваіх размерах будуць прадстаўляць значна шырэйшую і складанейшую кампанію. Каб правесці яе ўзорна, на высокім ідэйна-палітычным узроўні, трэба сур'ёзна папрацаваць над растлумачэннем выбаршчыкам Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона, над арганізацыяй многатысячнай арміі большэвіцкіх агітатараў, над уцягненнем шырокага партыйнага, комсамольскага, совецкага і профсаюзнага актыва ў гэтую работу.

Да свядомасці найшырэйшых мас горада і вёскі трэба ва ўсёй паўнаце давесці вялікае дзяржаўнае значэнне ў соцыялістычным будаўніцтве абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных. Трэба, каб уся работа па выбарчай кампаніі суправаджалася далейшым вытворчым уздымам на прадпрыемствах, будоўлях, у калгасах, соўгасах і вёсках, каб перадкастрычніцкае спаборніцтва за ўзорнае выкананне палітычна-гаспадарчых задач абласці атрымала яшчэ больш шырокі разварот.

Працоўныя заходніх абласцей, вызваленыя год таму назад ад соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, будуць упершыню ўдзельнічаць у выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Гэтыя выбары, як і выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР, з'яўляюцца найбольш свабоднымі і найбольш дэмакратычнымі выбарамі ў параўнанні з выбарамі ў любой капіталістычнай краіне свету.

Працоўныя заходніх абласцей за год совецкай улады набылі ўжо вялікі вопыт у дзяржаўным будаўніцтве. Тысячы адданых сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы плённа працуюць у сельскіх Советах, у абласных і раённых органах, на прадпрыемствах і ў школах. Творчая комуністычная ініцыятыва, адданая служба вызваленым народам і вялікай радзіме СССР дала свае пладатворныя вынікі. Поўным ходам працуе соцыялістычная прамысловасць і транспарт, з поспехам заканчваецца сельскагаспадарчы год, расце соцыялістычная па зместу і нацыянальная па форме культура. Аб гэтым ярка гавораць рабочыя на мітынгах, прысвечаных Указу Вярхоўнага Совета аб дні выбараў. Большэвіцкае правядзенне выбарчай кампаніі яшчэ больш памножыць нашы поспехі.

Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных будуць праведзены на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Артыкул 110 Канстытуцыі БССР гаворыць: „Выбары дэпутатаў з'яўляюцца ўсеагульнымі: усе грамадзяне БССР, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, адукацыйнага цэнза, аседласці, соцыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і ранейшай дзейнасці, маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных, за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў".

Такі сапраўдны дэмакратызм забяспечваецца толькі ў краіне соцыялізма — СССР. У любой капіталістычнай краіне правы выбаршчыкаў на выбарах у мясцовыя органы кіравання ў значна большай ступені абмежаваны чым на выбарах у парламент. Не гаворачы ўжо аб тым, што нідзе ў свеце, акрамя СССР, не існуе сапраўды ўсеагульнага выбарчага права.

Выбіраючы дэпутатаў у мясцовыя Советы, выбаршчыкі тым самым удзельнічаюць у фарміраванні важнейшых органаў улады, якія заклікаыы вырашаць адказныя дзяржаўныя функцыі. „Советы дэпутатаў працоўных кіруюць дзейнасцю падпарадкаваных ім органаў кіравання, забяспечваюць ахову дзяржаўнага парадку, захаванне законаў і ахову правоў грамадзян, кіруюць мясцовым гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, устанаўліваюць мясцовы бюджэт". (Артыкул 97 Канстытуцыі СССР). Таварыш Сталін на XVIII з'ездзе ВКП(б), гаворачы аб далейшых задачах соцыялістычнага будаўніцтва, указваў, што „Цяпер асноўная задача нашай дзяржавы ўнутры краіны заключаецца ў мірнай гаспадарча-арганізатарскай і культурна-выхаваўчай рабоце". Такім чынам на мясцовыя органы ўлады ўскладзена важнейшая дзяржаўная функцыя — кіраўніцтва культурна-палітычным і гаспадарчым будаўніцтвам на сваёй тэрыторыі.

Сутнасць соцыялістычнага дэмакратызма і совецкіх выбараў, як падкрэсліваў В. І. Ленін яшчэ ў першых годах совецкай улады, састаіць у тым, што „ствараецца найлепшая масавая арганізацыя авангарда працоўных, буйна-прамысловага пролетарыята, дазваляючая яму кіраваць найбольш шырокімі масамі эксплуатуемых, уцягваць іх у самастойнае палітычнае жыццё, выхоўваць іх палітычна на іх уласным вопыце, што такім чынам упершыню робіцца прыступ к таму, каб сапраўды **ПАГАЛОЎНА** насельніцтва вучылася кіраваць і пачынала кіраваць" (Ленін, том XXII стар. 465).

Перад нашай краінай стаяць велізарныя палітычна-гаспадарчыя задачы. Наша краіна акружана капіталістычнымі дзяржавамі. У капіталістычным свеце шугае полымя імперыялістычнай вайны. Толькі совецкі народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, геніем вялікага Сталіна, у мірных умовах будуе шчаслівае комуністычнае грамадства. Непераможная Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот забяспечваюць, пільна стоячы на варце, гэтае будаўніцтва. Міжнародная абстаноўка патрабуе ўсямернага ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны. Уся работа па выбарчай кампаніі павінна быць самым цесным чынам спалучана з гэтай найважнейшай усенароднай задачай.

Новымі вытворчымі перамогамі адзначым пачатак і правядзенне выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных!

Працоўныя Беластока аднадушна вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Радасць усіх працоўных

К 4 гадзінам дня зала клуба 6-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната запоўнілася рабочымі першай змены. Яны сабраліся сюды на мітынг, прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Прадстаўнік гаркома партыі тав. Мілаў у сваёй прамове расказаў прысутным аб вялікім значэнні выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях Беларусі.

У сваім выступленні рабочы тав. Філіпчак расказаў аб выбарах у панскай Польшчы. Тады выбіралі тых, хто быў багаты — фабрыкантаў, купцоў і памешчыкаў. Цяпер-жа мы выбярэм у мясцовыя органы ўлады сваіх прадстаўнікоў — працоўных, таго, хто будзе клапаціцца аб нашых інтарэсах, выбярэм стаханаўцаў і стаханавак.

Рабочы тав. Хрэноўскі гаворыць:

— Чырвоная Армія вызваліла нашу зямлю. Паны ўцяклі за граніцу. Рабочыя цяпер самі гаспадары сваёй краіны. Упершыню ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных мы будзем выбіраць па Сталінскай Канстытуцыі.

Работніца тав. Ражко расказала цікавы момант з выбараў у гарадское самаўпраўленне Беластока ў 1938 годзе. Пэпэсаўцы вылучалі кандыдатам аднаго з сваіх важакоў пана Капітулку. Але рабочыя не жадалі галасаваць за здрадніка і не выбралі яго. Кажуць, апавядае тав. Ражко, што пан Капітулка пасля гэтага тры дні хварэў, а потым хацеў павесіцца.

Пры панаванні памешчыкаў і капіталістаў жанчыну чалавекам не лічылі. Жанчына павінна была займацца толькі хатнімі справамі. Совецкая ўлада прадаставіла жанчынам аднолькавыя правы з мужчынамі.

Работніца тав. Беластачанская заклікала рабочых быць пільнымі і вылучаць кандыдатамі ў дэпутаты працоўных людзей, адданых вялікай партыі Леніна—Сталіна, выкрываць здраднікаў працоўных.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі падрыхтоўкі да правядзення выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, абавязаліся да 15 снежня выканаць гадавую вытворчую праграму і даць звыш плана 50 тысяч метраў тканіны.

Мітынг на трэцім камбінаце

2 гадзіны 30 мінут. На залітым сонцам двары 3-га тэкстыльнага камбіната сабраліся рабочыя і работніцы першай змены—каля двухсот чалавек. Яны прышлі паслухаць аб вялікай падзеі ў іх жыцці, аб першых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Мітынг адкрывае сакратар пярвічнай партарганізацыі тав. Тарасуль. Ён растлумачвае значэнне прадстаячых выбараў і заклікае рабочых сустрэць пачатак выбарчай кампаніі ўмацненнем працоўнай дысцыпліны і новымі вытворчымі перамогамі.

Слова атрымлівае тав. Еліна.

— У той час,—гаворыць яна,—калі ўвесь капіталістычны свет дрыжыць ад грукату гармат і ўзрываў бомб, мы мірна і спакойна будуем новае жыццё, працуем і выбіраем нашы органы ўлады—Советы. Яна зачытвае прысутным артыкулы Канстытуцыі аб Советах дэпутатаў працоўных.

Большасць рабочых 3-га камбіната пражывае ў раёне Выгоды, дзе няма каналізацыі, брукаў, вучням далёка да школы, мала магазінаў, дрэнная сувязь з горадам. Пашлём у Советы лепшых сыноў і дачок народа, стаханаўцаў і перадавых рабочых, якія пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў будуць працаваць над паляпшэннем умоў жыцця. Мы-ж з свайго боку будзем змагацца за далейшае ўмацненне працоўнай дысцыпліны, за больш высокаякасныя тканіны.

— Мы, рабочыя, не мелі ў час польскай акупацыі сваіх прадстаўнікоў у мясцовых органах улады, — гаворыць тав. Петрак з ткацкага цэха.—Цяпер-жа мы выбярэм дэпутатаў у свой Совет. Рабочыя ў капіталістычных краінах і цяпер не маюць магчымасці свабодна збірацца пасля работы і абмяркоўваць, як праводзіць выбары. Свабоду, мір і працу дала нам наша слаўная Чырвоная Армія, совецкая ўлада, партыя большэвікоў.

Слова бярэ высокі юнак—першы стаханавец Осавіцкі. Ён гаворыць:

— Моладзь у капіталістычнай Польшчы не мела выбарчага права, а совецкая моладзь карыстаецца ўсімі палітычнымі правамі. Перад намі адкрыты ўсе шляхі. У ЗША існуе шматмільёная армія беспрацоўнай моладзі, а ў нас — армія стаханаўцаў. Ва Францыі сотні тысяч бежанцаў вандруюць без даха над галавой, — а ў нас сотні тысяч едуць у дамы адпачынку. Калі будзе трэба, ніхто з нас не пашкадуе свайго жыцця для абароны радзімы. А цяпер мы яе ўзмацняем, даючы ёй больш сукна. Шырыцца стаханаўскі рух. Калі я пераходзіў на абслугоўванне двух станкоў, то тав. Стоцкі гаварыў, што гэта немагчыма. А цяпер сам тав. Стоцкі працуе на двух станках, выконвае норму на 115 процантаў і з'яўляецца лепшым нашым ткачом.

Тав. Осавіцкі заканчвае сваю прамову паведамленнем аб стварэнні маладзёжнай стаханаўскай брыгады ў чэсць XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі і дня выбараў—15 снежня.

Тав. Кузняцоў, прадстаўнік гаркома КП(б)Б, у кароткай змястоўнай прамове растлумачвае значэнне гістарычнага Указа і, пры глыбокай цішыні і напружанай увазе прысутных, зачытвае вядомыя сталінскія словы аб тым, якім павінен быць дэпутат народа.

Пад апладысменты прымаецца рэзалюцыя, у якой рабочыя 3-га камбіната абавязваюцца ў чэсць дня выбараў выканаць гадавую вытворчую праграму да 15 снежня.

Да дня выбараў выканаем гадавы план

На беластоцкім тэкстыльным камбінаце № 4 рабочыя і служачыя Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб назначэнні дня выбараў у мясцовыя Советы Заходніх абласцей БССР прачыталі яшчэ ў выхадны дзень. І калі ўчора, адразу пасля заканчэння работы першай змены старшыня фабкома тав. Цобіна паведаміла рабочым аб зборы на мітынг, усе ведалі, што будзе абмяркоўвацца выключна важнае пытанне.

За некалькі мінут на двары сабралася ўся змена. Тав. Цобіна прадаставіла слова прадстаўніку гаркома КП(б)Б тав. Арловай. З выключнай увагай слухаюць прысутныя дакладчыцу, якая гаворыць аб Указе, аб самых дэмакратычных у свеце выбарах, аб нашых народных дэпутатах. Затым слова атрымоўвае намеснік дырэктара камбіната тав. Сытоў.

— Наш камбінат у дні выбарчай кампаніі павінен заняць адно з першых месц у Беластоку. Мы можам і павінны ў чэсць выбараў да 15 снежня поўнасцю выканаць гадавы вытворчы план.

Да стала падыходзіць электраманцёр камбіната тав. Ферšт. У сваёй яркай прамове на польскай мове ён сказаў:

— За год совецкай улады мы дасягнулі небывалых поспехаў. На нашых вачах змяніўся і непазнавальна вырас наш камбінат. На сваім прадпрыемстве мы самі з'яўляемся гаспадарамі. Усё гэта — вынік таго, што намі кіруюць большэвікі, што намі кіруе наша вялікая партыя Леніна—Сталіна. І вось таму за большэвікоў, за нашых лепшых рабочых і служачых, за партыю Леніна — Сталіна будзем галасаваць пры выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Затым выступае стаханавец-двухстаночнік тав. Плонскі.

— У былой панскай Польшчы,—гаворыць ён, — выбары ў магістраты праходзілі пры нябачаным тэроры. Нас прымушалі галасаваць за ненавісных народу паноў. Пры совецкай-жа ўладзе — выбары свабодныя, і мы маем магчымасць выбіраць у органы ўлады сваіх лепшых рабочых, лепшых барацьбітоў за справу комунізма. Заклікаю ўсіх рабочых і служачых у выбарах у мясцовыя Советы прыняць самы актыўны ўдзел. У чэсць выбараў, у чэсць 23-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі я абяцаю ў бліжэйшыя дні перайсці з двух на абслугоўванне чатырох станкоў.

Пад усеагульнае адабрэнне рабочых і служачых выступаючыя абяцаюць прыняць у выбарчай кампаніі актыўны ўдзел, агітаваць за дастойных кандыдатаў, якія будуць вылучаны працоўнымі горада.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі першай змены 4-га тэкстыльнага камбіната запісалі:

«Вітаем Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР і абавязуемся да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных выканаць гадавы план па ўсіх паказчыках. Да дня 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі план выканаем па ткацкаму цэху на 118 процантаў, па апаратна-прадзільнаму — на 122 проценты. З мэтай шырэйшага разгортвання стаханаўскага руху ў бліжэйшыя дні створым дзве стаханаўскія школы для прадзільшчыц. З ткацкіх станкоў абяцаем выпусціць не менш 98 процантаў першага сорту прадукцыі. У дзень выбараў як адзін з'явімся на выбарчыя ўчасткі і аддадзім свае галасы за кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных».

Па Совецкай краіне



На Мінскім радыёзаводзе імені Молатава пушчаны тры цэхі: механічны, літаграфскі і папяровых кандэнсатараў. У бліжэйшыя дні пачне работу цэх зборкі прыёмнікаў. На здымку: за праверкай прыёмніка радыё ўрач М. Ш. Шулькін (сядзіць) і тэхнік А. Г. Зусман. Фота Шышко.

Фотахроніка БЕЛТА.

ВІЛЬНЮСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

ВІЛЬНЮС. (ТАСС). Адкрыўся Вільнюскі дзяржаўны тэатр. Да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі рыхтуецца пастаноўка п'есы Вс. Іванова «Бронепоезд 14-69».

200-ГОДДЗЕ ПЕТРАПАЎЛАЎСКА-НА-КАМЧАТЦЫ.

ПЕТРАПАЎЛАЎСК-на-Камчатцы.

Працоўныя горада адзначаюць 200-годдзе заснавання Петрапаўлаўска-на-Камчатцы.

У пачатку 1740 года ў Аванчынскую бухту ўвайшлі караблі другой камчацкай экспедыцыі Берынга. Невялікую, добра захаваную ад ветра гавань, дзе экспедыцыя астанавілася на зімоўку, Берынг назваў Петрапаўлаўскам. Да канца XIX века ў Петрапаўлаўску ўсяго было 395 жыхароў. Зараз у горадзе дзесяткі тысяч жыхароў, прыгожыя вуліцы, многа школ, педагагічнае вучылішча, клубы, тэатры, бальніцы. Бюджэт горада ў гэтым годзе перавышае 57 мільёнаў рублёў. Сотні параходаў штогод наведваюць порт. Горад звязан таксама пастаяннымі авіяцыйнымі лініямі з радам раёнаў краіны.

У ГАРАХ НА МАТАЦЫКЛЕ

СІМФЕРОПАЛЬ. (ТАСС). Група матацыклістаў Керчы, Ялты, Севастопаля і Сімферопаля на машынах совецкай вытворчасці, пераабсталяваных для перасоўвання па горных сцежках, зрабіла вялікі прабег па крымскіх гарах. У цяжкіх метэаралагічных умовах, пад даждём адважным вадзіцелям прыходзілася пераматаць крутыя перавалы, прабірацца па краях абрываў, праходзіць па дну ўшчэлляў. Упершыню дасягнулі матацыклісты вяршыні самай высокай гары Крыма—Раман-Кош (1.543 метры над узроўнем мора). Пабывалі яны таксама на вяршыні гары Эклізы-Бурун (1.525 метраў).

ЭКСКУРСІЯ НА ЎСЕСАЮЗНУЮ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧУЮ ВЫСТАЎКУ

Дом Народнай Творчасці БССР арганізаваў для лепшых ткачых і вышывальшчыц рэспублікі экскурсію на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Сярод іх узнагароджаныя граматамі Вярхоўнага совета БССР калгасніцы Марыя Ліпай (калгас «Першае Мая» Уздзенскага раёна), Елізавета Івашка (калгас «Ленінская слабада» Пухавіцкага раёна), Аляксандра Серада (калгас «Трэці рашаючы» Краснапольскага раёна), лепшыя вышывальшчыцы тт. Арбузова (Гомель), Петракова (Орша) і другія.

(БелТА).



Нова-Барысаўская ганчарна-керамічная промарцель „Чырвоны кастрычнік" (Мінская вобласць) выпускае розныя мастацкія вырабы. Лепшыя ўзоры работы арцелі экспаніраваліся на Парыжскай выстаўцы. Рад вырабаў прадстаўлен цяпер на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. На здымку: майстар-мадэльшчык М. Е. Кривaротаў за адборам мастацкіх вырабаў для Ўсебеларускай выстаўкі—„Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці"
Фота І. Шышко.

Фотахроніка БЕЛТА.

Год партыйнай работы ў заходніх абласцях Беларусі

Г. ЭЙДЗІНАЎ,
заг. оргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Беларусі

Прайшоў год з часу, калі вялікі Савецкі Саюз працягнуў руку брацкай дапамогі ўкраінцам і беларусам, насяляўшым былую Польшчу, і вызваліў іх ад іга памешчыкаў і капіталістаў.

Партыйная работа ў вызваленым краі была пачата з першых-жа дзён выступлення Чырвонай Арміі. Разам з перадавымі часцямі ў Заходнюю Беларусь накіроўваліся сотні лепшых комуністаў для дапамогі народу ў арганізацыі новай, рэвалюцыйнай улады.

У гістарычныя верасеньскія дні ў Цэнтральным камітэце комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі адбіраліся найбольш энергічныя, правераныя кадры партыйных работнікаў.

Па меры вызвалення ў гарадах і паветах утвараліся Часовыя ўпраўленні з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, Чырвонай Арміі і пасланых на работу ў Заходнюю Беларусь партыйных таварышоў.

Часовыя ўпраўленні адразу сталі цэнтрам палітычнай, гаспадарчай і культурнай работы, яны дапамагалі працоўным падавіць супраціўленне астаткаў пануючых класаў і іх агентуры і ўстанавіць новы, рэвалюцыйны парадак. Яны кіравалі зломам старой машыны дзяржаўнага ўпраўлення і правялі велізарную работу па шырокаму прыцягненню працоўных мас да арганізацыі савецкай улады. Яны накіроўвалі дзейнасць сялянскіх камітэтаў, узначаліўшых падзел сялянамі памешчыцкіх і манастырскіх зямель. У дні падрыхтоўкі і правядзення выбараў у Народнае Сабранне Часовыя ўпраўленні правялі вялікую палітычную, агітацыйную і прапагандысцкую работу па раз'ясненню асноў савецкай улады, поспехаў социялістычнага будаўніцтва ў СССР і задач, якія стаяць перад працоўнымі заходніх абласцей.

Народ патрабаваў устанаўлення савецкай улады, канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці, з'еднання з Саюзам Савецкіх Социялістычных Рэспублік.

28—30 кастрычніка 1939 года Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, выконваючы волю народа, аднадушна прыняло дэкларацыю аб устанаўленні на тэрыторыі Заходняй Беларусі савецкай улады і гістарычныя рашэнні аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці, аб далучэнні да Саюза Савецкіх Социялістычных Рэспублік.

Надзвычайная сесія Вярхоўнага Совета СССР 2 лістапада 1939 года прыняла закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў Саюз Савецкіх Социялістычных Рэспублік са з'еднаннем яе з Беларускай Савецкай Социялістычнай Рэспублікай.

Пасля рашэнняў Народнага Сабрання вызвалены народ разгарнуў каласальную творчую работу ва ўсіх галінах вытворчасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, у галіне навукі і культуры.

Рэвалюцыйную энергію народа ўзначалілі большэвікі. У снежні 1939 года пачалі ствараццa павятовыя партыйныя і комсамольскія арганізацыі. Большэвікі ўстанавілі цесную сувязь з працоўнымі.

Звергнуўшы эксплаататараў, народ стаў гаспадаром свайго жыцця. Звыш 439 тысяч гектараў зямлі было размеркавана паміж батракамі, беднякамі і серадн якамі. Фабрыкі, заводы, банкі сталі агульнанародным здабыткам. На фабрыцы Шпіра, Фукса ў Беластоку, як і на ўсіх іншых фабрыках і заводах былі назначаны камісары з ліку рабочых, праявіўшых сябе ў часе ўстанаўлення новай, рэвалюцыйнай улады.

Гэта былі дні, калі рабочыя камітэты ўстанаўлівалі кантроль над вытворчасцю, апісвалі маёмасць, падлягаючую нацыяналізацыі, а ўласнікі прадпрыемстваў далікатна спраўляліся, ці не могуць яны быць пакінуты ў якасці «загадчыкаў» заводаў або ў якасці «намеснікаў».

На працягу некалькіх месяцаў на заводы былі прыняты дзесяткі тысяч новых рабочых. Партыйныя арганізацыі прыступілі да ліквідацыі беспрацоўя—гэтага пастаяннага спадарожніка капіталістычнай эксплаатацыі.

У гэты перыяд задачы партыйных арганізацый заключаліся ў тым, каб, перадаючы вопыт нашай рэвалюцыі, дапамагчы народу падавіць супраціўленне памешчыкаў і капіталістаў, нацыяналізаваць прамысловасць, да канца ліквідаваць памешчыцкае землеўладанне, зламаць стары дзяржаўны апарат і прыцягнуць дзесяткі тысяч рабочых і сялян да ўпраўлення дзяржавай.

Ужо к пачатку студзеня 1940 года працоўныя заходніх абласцей Беларусі пад кіраўніцтвам большэвікоў рашылі ў асноўным гэтыя задачы.

Існаваўшае ў былой Польшчы адміністратыўна-тэрытарыяльнае дзяленне на ваяводствы, паветы і воласці будавалася на ўліку інтарэсаў памешчыцка-капіталістычных класаў, тармазіла гаспадарчае, культурнае развіццё края і мела мэтаю падавіць нацыянальнае самасазнанне беларусаў.

Пасля стараннай падрыхтоўкі новага раёніравання ў Заходняй Беларусі былі ўтвораны 5 абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская. У лютым ва ўсіх 101 раёне былі створаны раённыя камітэты партыі і райвыканкомы, якія закончылі работу па скасаванню валасцей і ўтварэнню сельсоветаў. У лютым-жа пачалі ствараццa пярвічныя партыйныя арганізацыі. У даны момант партыйныя арганізацыі заходніх абласцей налічваюць у сваіх радах 14.666 членаў і кандыдатаў партыі. Створана 1.106 пярвічных партыйных арганізацый, у тым ліку 185 у прамысловых прадпрыемствах, на электрастанцыях і на транспарце.

Гарадскія партыйныя арганізацыі абласных цэнтраў налічваюць у сваім саставе ад 400 да 1.800 комуністаў. Партыйная арганізацыя Беластока мае 1.837 комуністаў, Баранавіцкая — 1.098 комуністаў, Пінская—816, Брэсцкая—957 і т. д.

Будаўніцтва савецкага апарата, камплектаванне гаспадарчых, каапэратыўных, культурных устаноў складалі важнейшую задачу партыйных арганізацый. Трэба было ўважліва вывучаць абстаноўку, старанна адбіраць у савецкі апарат лепшых людзей з мясцовага насельніцтва, не дапускаць у яго прадажных агентаў былога польскага ўрада, ачышчаць апарат ад пранікшых паследышаў разгромленых контррэвалюцыйных партый: ППС, «хадэцый», бундаўцаў, сіяністаў і іншых.

Абласныя і раённыя камітэты партыі правялі курсы гаспадарнікаў і курсы старшынь сельсоветаў, падрыхтаваўшы тысячы людзей да вялікай гаспадарчай і савецкай работы.

У адной толькі Беластоцкай вобласці на кіруючую гаспадарчую і профсаюзную работу было вылучана больш 4 тысяч чалавек: 240 — дырэктарамі фабрык і заводаў, 769—начальнікамі цэхаў і майстрамі, 527—старшынямі фабзаўмясцкомаў. Усе яны ў большасці сваёй карэнныя, кадравыя рабочыя: тав. Каплан, маючая 15-гадовы стаж прадзільшчыцы, працуе цяпер дырэктарам тэкстыльнай фабрыкі; тав. Рашчук, тэкстыльшчыца з 20-гадовым стажам, стала дырэктарам лентачнай фабрыкі; тав. Топаль, ткач з 15-гадовым стажам,—цяпер дырэктар тэкстыльнай фабрыкі.

У сельскіх советах заходніх абласцей зараз працуе больш 10 тысяч перадавых сялян. Многія з іх вырастаюць у сапраўдных дзяржаўных дзеячоў, вылучаны на кіруючую савецкую, гаспадарчую і культурную работу, некаторыя выбраны дэпутатамі Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Партыйныя арганізацыі правялі вялікую работу па ўздыму народнай гаспадаркі ў новых абласцях рэспублікі. Каланізатарская палітыка польскіх правячых кругоў прывяла да таго, што Заходняя Беларусь значна адстала ў сваім развіцці. Узровень вытворчасці прамысловай прадукцыі тут быў у 9 разоў ніжэй, чым у Беларускай ССР.

З устанаўленнем савецкай улады занава пачала ствараццa тэкстыльная прамысловасць. Беласток ператвараецца ў буйнейшы тэкстыльны цэнтр. Паявіліся новыя галіны прамысловасці: харчовая, керамічная, будаўнічая, лесаапрацоўчая. Аб'ём валавой прадукцыі амаль падвоіўся, вытворчасць запалак патроілася, выпуск шарсцяных тканін павялічыўся на 169 проц.

Комуністы ўзначалілі грандыёзныя работы па будаўніцтву Днепра-Бугскага воднага шляху. 200 тысяч сялян прымалі ўдзел у збудаванні воднай магістралі працяжнасцю ў 202 кілометры.

На прадпрыемствах комуністы і комсамольцы падтрымліваюць і развіваюць новыя адносіны да працы, узнікшыя ў рабочых, якія аслабаніліся ад капіталістычнага гнёту. Комуністы расказвалі рабочым аб вопыце социялістычнага спаборніцтва, аб стаханаўскім руху, шырока папулярызавалі перадавых рабочых, упершыню пачаўшы перавыконваць нормы.

Вытворчыя партыйныя арганізацыі накапілі ўжо вопыт кантролю дзейнасці адміністрацыі. Ажыццяўленне кантролю на фабрыках і заводах заходніх абласцей мае свае асаблівасці ў сувязі з тым, што большасць камандзіраў вытворчасці вылучана з мясцовых рабочых і ў многіх выпадках яшчэ не паспела набыць дастатковага вопыту. На дапамогу гэтым кадрам прыходзіць калектыўны вопыт партыйных арганізацый.

Характэрна ў гэтых адносінах работа партыйнай арганізацыі запалкавай фабрыкі імені 17 верасня ў Пінску. Абмяркоўваючы вытворчыя пытанні, партыйная арганізацыя падказала дырэкцыі фабрыкі спосабы павысіць прадукцыйнасць працы. Па-новаму паставілі комуністы пытанне аб тэхніцы безапаснасці. Гаспадара-капіталіста, вядома, не турбавалі няшчасныя выпадкі, апёкі пры рабоце на набіўных машынах. Комуністы прапанавалі ўвесці спецыяльныя маскі для прадухілення апёкаў. Комуністы навучылі рабочых больш дасканалым метадам работы. Да невыконваўшых нормы прымацоўвалі стаханаўцаў. Партыйная арганізацыя разгарнула агітацыйную работу. Усё гэта дало магчымасць невялікай па саставу партыйнай арганізацыі павесці за сабой увесь вытворчы калектыў. На фабрыцы 117 стаханаўцаў, 400 ударнікаў, паявіліся першыя 12 многастаночнікаў, да работы якіх уважліва прыглядаюцца ўсе рабочыя.

Комуністы асабістым прыкладам вучаць рабочых стаханаўскім метадам працы. У дэпо станцыі Беласток член партыі тав. Купін, працуючы на старым, поўпрыгодным станку, увесь час даваў 2—2,5 нормы ў дзень. Аднойчы ён сабраў сваіх таварышоў па цэху і стаў раз'ясняць у чым заключаецца яго метад работы. Чыгуначнікі былі здзіўлены: ім не прыходзілася сустракаць раней, каб больш вопытны майстар паведамляў каму-небудзь сакрэты сваёй работы.

Праз некалькі дзён да сакратара партыйнай арганізацыі зайшоў малады рабочы тав. Мацэйка і сказаў: «Я зразумеў цяпер ролю і значэнне спаборніцтва. Паглядзіце, таварыш сакратар, ці так я напісаў свой социялістычны дагавор».

Гэта было некалькі месяцаў назад. Зараз, следуючы прыкладу тав. Купіна, у дэпо паявіліся дзесяткі стаханаўцаў, ударнікаў і многастаночнікаў.

Стаханаўскай работай на социялістычных прадпрыемствах рабочыя пад кіраўніцтвам комуністаў дабіваюцца няўхільнага павышэння прадукцыйнасці працы, значнага паляпшэння сваіх матэрыяльна-бытавых умоў.

Велізарная дапамога аказана ўрадам Савецкага Саюза сельскай гаспадарцы заходніх абласцей: арганізавана 101 МТС з паркам у 950 трактараў, 1.190 аўтамашын, 300 складаных малатарань, 438 культыватараў і т. п.

Найбольш перадавыя сяляне, батракі і беднякі, грунтуючыся на вопыце социялістычнага будаўніцтва ў СССР, прыступілі да арганізацыі на добраахвотных пачатках калгасаў. 605 калгасаў еднаюць зараз 30 тысяч сялянскіх гаспадарак. Партыйныя арганізацыі перадаюць ім вопыт, які накапіўся ў нашых калгасах, вучаць іх арганізацыі працы, пастаноўцы калгаснага ўліку.

Сяляне з вялікай цікавасцю адносяцца да калгасаў. Яны на ўласным вопыце пераконваюцца ў велізарнай перавазе социялістычнага вядзення сельскай гаспадаркі.

Нядаўна ў адной з вёсак сялянекалгаснікі Высокаўскага раёна выявілі брашурку буржуазнага нацыяналіста, выданую ў Вільне некалькі год таму назад, пад назвай «Што такое калгасы». У гэтай брашурцы нямнога «тэарэтычных» выкладак, нямнога падтасаванай «статыстыкі», а больш за ўсё злобнай хлусні і паклёпу на калгасы. Прачыталі калгаснікі брашурку і яшчэ раз пераканаліся, як нахабна хлусілі, па заказу памешчыкаў, буржуазныя пісакі, выдумляючы небыліцы аб жыцці ў СССР. Перад вачыма сялян жывыя, пераканаўчыя прыклады. Калгас імені 17 верасня, Высокаўскага раёна, выканаўшы свае абавязацельствы перад дзяржавай, засыпаўшы насенныя і страхавыя фонды, выдаў калгаснікам авансам на працадзень па 3 рублі і па 5 кілаграмаў зернавых.

Працоўныя сяляне чэсна працуюць на зямлі, яшчэ нядаўна належаўшай польскім магнатам і памешчыкам, і ўпершыню самі карыстаюцца вынікамі сваёй працы. Пагроза голаду і беспрацоўя знята назаўсёды.

Вялікую работу ў вёсцы разгарнулі сельскія советы. Яны ператварыліся ў поўнаўладныя органы савецкай улады на мясцах, прыцягваюць да работы многатысячны актыў з асяроддзя сялян — батракоў, беднякоў, серадн якоў,—сельскай інтэлігенцыі, клапоцяцца аб развіцці народнай асветы, аховы здароўя і т. д.

Прайшоўшы год у заходніх абласцях быў годам сапраўднай культурнай рэвалюцыі. Увядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання, шырокі доступ для працоўных ва ўсе навучальныя ўстановы, стварэнне сеткі тэатраў, кіно і іншых культурных устаноў, масавае развіццё народнай творчасці — усё гэта стварыла велізарныя магчымасці для далейшага развіцця культуры, навукі і мастацтва. У гарадах і сёлах створаны сотні кінотэатраў, адкрыта 5 дамоў народнай творчасці, 6 тэатраў, з іх 3 беларускія, 1 рускі, 1 польскі і 1 яўрэйскі. Працуе больш 600 хат-чытален.

Комуністы і працоўныя заходніх абласцей праяўляюць велізарную цікавасць да вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», партыйныя арганізацыі аказваюць ім у гэтым сур'ёзную дапамогу.

Аб велізарнай цікавасці да марксісцка-ленінскай тэорыі сведчыць той факт, што на працягу некалькіх месяцаў у адной толькі Баранавіцкай вобласці прадана 810 тысяч экземпляраў марксісцка-ленінскай літаратуры.

ЦК КП(б)Б звярнуў увагу партыйных арганізацый заходніх абласцей на іх асобыя задачы ў арганізацыі масава-палітычнай работы.

Нашы агітатары і прапагандысты, раз'ясняючы знешнюю і ўнутраную палітыку СССР, часам забывалі аб вельмі важным: яны не падкрэслівалі, што социялізм у Савецкім Саюзе пабудаван упорнай і гераічнай працай савецкага народа, што будаўніцтва социялізма было звязана з пераадоленнем вялікіх цяжкасцей, з разгромам ворагаў, якія прабавалі затармазіць і сарваць социялістычнае будаўніцтва.

У заходніх абласцях яшчэ моцны розныя забабоны: рэлігійныя, нацыянальныя, расавыя, цэхавыя. Павярхоўная агітацыя не можа мець поспеху ва ўмовах, калі так глыбокі перажыткі капіталізма ў сазнанні людзей. Таму партыйныя арганізацыі стараюцца зрабіць агітацыю больш канкрэтнай, насычанай і дзейснай. Яны працуюць над вывучэннем мясцовых умоў, гісторыі края, гісторыі барацьбы класаў і адносін паміж рознымі социяльнымі групамі. Вывучаюць існаваўшыя ў былой Польшчы контррэвалюцыйныя партыі, іх прыёмы і метады апрацоўкі сазнання працоўных.

Гэта дапамагло партыйным арганізацыям ужо ў ходзе справаздачнавыбарчай кампаніі профсаюзаў выкрываць і выганяць з профсаюзаў паследышаў разгромленых контррэвалюцыйных партый.

ЦК КП(б) Беларусі звярнуў увагу партыйных арганізацый на тое, што некаторыя партыйныя, савецкія работнікі не зразумелі ўсёй складанасці новай абстаноўкі, не зразумелі таго, што недабітыя ворагі — агенты былой польскай улады і розных капіталістычных разведак — будуць прабаваць пранікаць у ствараемы дзяржаўны апарат, і праяўлялі бяспечнасць пры падборы супрацоўнікаў у савецкі і гаспадарчы апарат, дапускаючы засмечанне яго ў асобных звеннях.

Пасля ўказанняў ЦК КП(б)Б раённыя камітэты партыі прынялі меры да ачышчэння савецкіх і гаспадарчых органаў ад варожых і прымазаўшыхся элементаў і шырэй пачалі прыцягваць да работы найбольш праявіўшых сябе ва ўстанаўленні рэвалюцыйнага парадку рабочых, сялян і прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі.

Партыйныя арганізацыі вядуць вялікую работу па палітычнай асвеце працоўных заходніх абласцей, арганізуюць лекцыі ў гарадах і сёлах, на курсах, настаўніцкіх семінарах, штодзённа праводзяць гутаркі сярод рабочых, сялян і навучаючыхся.

Да чытання лекцый прыцягваюцца і мясцовыя нацыянальныя кадры. Многія лекцыі чытаюцца на польскай, яўрэйскай мовах.

Магутнай зброяй у руках партыйных арганізацый служаць раённыя газеты. Разавы тыраж абласных і раённых газет дасягае 173 тысяч экземпляраў. Друк карыстаецца каласальным аўтарытэтам. Дастаткова сказаць, што штодзённа ў заходніх абласцях распаўсюджваецца 432.690 экз. саюзных, рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.

У гарадах Ломжы, Аўгустове, Граеве і Лапах газеты выходзяць на польскай мове. Гэтымі днямі пачала выдавацца на польскай мове рэспубліканская газета «Штандар вольносці» — орган ЦК КП(б) Беларусі.

Ва ўсёй рабоце, правадзімай у заходніх абласцях, сур'ёзную дапамогу партыі аказваюць комсамольскія арганізацыі, якія налічваюць у сваіх радах 23.690 чалавек.

Урад былой Польшчы, нацыяналістычныя партыі і арганізацыі рабілі ўсё магчымае, каб атруціць сазнанне моладзі ядам нацыяналізма і мракабесся. Яны стварылі велізарную колькасць усякага роду рэакцыйных маладзёжных арганізацый і спартыўных саюзаў, асноўная задача якіх заключалася ў тым, каб прывіваць пачуццё нянавісці да комуністычных ідэй, да Савецкага Саюза, распальваць буржуазны нацыяналізм і варожыя адносіны да іншых нярольскіх нацый. У школах насаджаліся арганізацыі скаутаў, гарцэжы. На сяле дзейнічалі «Коло млодзежы вейскей» («Саюз сялянскай моладзі») і «Млода весь» («Саюз моладзі вёскі»), у гарадах — «Стральцы» і «Озон», «Бейтар» — яўрэйская сіяністская арганізацыя, «Цукунфт» — маладзёжная бундаўская арганізацыя, і многія іншыя. Сапраўдная сутнасць гэтых арганізацый скрывалася за дэмагагічнымі лозунгамі і праграмамі.

Прышоў канец іх растленнаму ўплыву.

Комсамольскія арганізацыі акружылі сябе лепшымі прадстаўнікамі рабочай і сялянскай моладзі. У індывідуальных гутарках, у гуртках комсамольцы-агітатары нясуць у масы слова большэвіцкай праўды. Юнакам і дзяўчынам яны падрабязна расказвалі аб Краіне советаў, аб Леніне і Сталіне, аб Сталінскай Канстытуцыі, аб комсамоле і яго статуце.

Многія лепшыя прадстаўнікі рабоча-сялянскай моладзі Заходняй Беларусі аказвалі ў перыяд верасеньскіх падзей 1939 года дапамогу часцям Чырвонай Арміі. Яны з першых-жа дзён кроўна звязалі сябе з ленінска-сталінскім комсамолам. Створана 1534 пярвічныя комсамольскія арганізацыі, у тым ліку 163 — у калгасах, 123 — на прадпрыемствах і на будаўніцтве, 101 — у школах, 14 — у вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах.

Гэта — велізарная сіла, якая пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый вядзе вялікую выхаваўчую работу.

Па ініцыятыве комсамольцаў шырокае распаўсюджанне атрымала будаўніцтва мясцовых дарог, дабрабыт гарадоў і сёл, стварэнне бібліятэк, клубаў, хат-чытален. У мястэчку Картуз-Бяроза, некалі адным з самых жудасных польскіх канцэнтрацыйных лагераў, сіламі комсамольцаў абсталяваны два кінотэатры, бібліятэка, клуб, разгорнута вялікая масава-палітычная работа сярод насельніцтва: у шасці гуртках палітграматы займаецца 276 чалавек.

Імкненне мясцовай моладзі да ўступлення ў рады комсамола безупынна расце.

Дзятлаўскі райком комсамола нядаўна атрымаў такое пісьмо:

«Мною арганізаван пры школе ў вёсцы Серафімы свой комсамол, на вячэрніх гуртках мы вывучаем Сталінскую Канстытуцыю, чытаем вытрымкі з газет адносна творчасці і дзейнасці нашых правадыроў і РСЧА. Арганізаван хор. Маем жаданне атрымаць зборнік народных песень. Просім разабраць пытанне аб нашым прыёме ў комсамол».

Пазбаўленая ў мінулым усякіх правоў, беларуская, яўрэйская і працоўная польская моладзь перанасіла ўсе цяготы нацыянальнага і эканамічнага прыгнечання. Праца моладзі цанілася вельмі нізка.

Савецкая ўлада прадаставіла працоўнай моладзі — беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай — неабмежаваныя магчымасці для яе росту, для набыцця кваліфікацыі. Перад моладдзю адкрыўся шлях у школы, у вышэйшыя навучальныя ўстановы, да высот навукі. У школы прышлі сотні тысяч дзяцей рабочых і сялян, якія ў мінулым і марыць не маглі аб вучобе.

У заходніх абласцях зараз 4.278 беларускіх, 173 рускія, 932 польскія, 150 яўрэйскіх, 61 літоўская і 49 украінскіх школ.

Астаткі эксплаататарскіх класаў, разбітых контррэвалюцыйных партый, клерыкальныя элементы вялі шавіністычную агітацыю, яны прабавалі адцягнуць моладзь ад савецкіх навучальных устаноў, распаўсюджвалі ўсякага роду контррэвалюцыйныя выдумкі. Тым не менш моладзь усіх нацыянальнасцей накіравалася да вучобы. У кожнай школе комсамольскія і піонерскія арганізацыі дапамагаюць моладзі аслабаніцца ад груза забабон, прывітых ім ва ўмовах былой Польшчы.

* * *

Перад партыйнымі арганізацыямі заходніх абласцей стаяць велізарныя задачы па социялістычнай перабудове народнай гаспадаркі, культуры і быту заходніх абласцей Беларускай ССР, па далейшаму ўцягненню працоўных у актыўны ўдзел у социялістычным будаўніцтве, па палітычнай асвеце мас.

З'еднаны беларускі народ, які пранёс скрозь стагоддзі сваю культуру, нянавісць да ворагаў, волю да перамогі, згуртаван вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна беларускі народ пойдзе да новых перамог, да комунізма.

(«Партийное строительство» № 17 за 1940 г.).

Падрыхтоўка ў Беластоку да святкавання 23-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

Пры Беластоцкім гаркоме КП(б)Б арганізавана камісія пад старшынствам сакратара гаркома партыі тав. Раманава па падрыхтоўцы да святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі.

На бюро гаркома зацверджан план падрыхтоўкі і правядзення свята.

Распрацавана тэматыка афармлення горада. Плошча імені Леніна будзе аформлена на тэму: «СССР за 23 годы», «СССР — вялікая чыгуначная дзяржава». Насупроць гарадскога тэатра будзе ўстаноўлена вялікая фотавітрына стаханаўцаў і знатных людзей Беластока. У Доме партыйнай асветы арганізуецца вялікая выстаўка «Дасягненні савецкага Беластока за год».

Падрыхтоўка да свята разгарнулася і на прадпрыемствах. Агітатары ў цэхах праводзяць з рабочымі гутаркі аб XXIII гадавіне Кастрычніка. На ўсіх прадпрыемствах будуць праведзены сходы з дакладамі дырэктараў прадпрыемстваў аб выніках социялістычнага спаборніцтва за дастойную сустрэчу слаўнай гадавіны.

18 кастрычніка адбудзецца гарадскі сход інтэлігенцыі па пытаннях падрыхтоўкі да свята. 25 кастрычніка для стаханаўцаў горада будзе прачытан даклад аб дасягненнях СССР за 23 годы.

Саюз мастакоў для афармлення горада і калон дэманстрантаў вылучыў брыгаду мастакоў. Калона тэкстыльшчыкаў будзе аформлена на тэму «Зробім Беласток другім Іванавам».

—0—

У абкоме КП(б)Б

Днямі на пасяджэнні бюро абкома КП(б)Б было разгледжана пытанне аб правядзенні справаздач і выбараў кіруючых мопраўскіх органаў.

У прынятым рашэнні адзначана вялікая работа, якую правяла за прайшоўшыя 10 месяцаў абласная арганізацыя МОПР'а. Арганізацыя прыняла актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, праводзімых партыяй і ўрадам. Асабліва вялікая работа праведзена мопраўскай арганізацыяй у Беластоку, Ломжы і Гродне. У выніку наглядаецца значны рост радоў МОПР'а. Абласная арганізацыя зараз налічвае 37 тысяч членаў.

Адначасова бюро абкома партыі ўказала і на рад істотных недахопаў у рабоце мопраўскай арганізацыі. Слаба пастаўлена работа ў вёсцы, нездавальняюча працуюць Свіслацкі, Аўгустоўскі, Скідзельскі, Снядаўскі райкомы МОПР'а. А такія райкомы, як Парэцкі, Замбраўскі, Кольнаўскі і Монькаўскі, зусім бяздзейнічаюць.

Некаторыя райкомы КП(б)Б праявілі недаацэнку мопраўскай работы, якая выразілася ў недастатковым кіраўніцтве пярвічнымі арганізацыямі МОПР'а. Не ўсюды ў работу МОПР'а ўцягнуты мясцовыя актывісты, асабліва былыя палітзняволеныя.

Падкрэсліўшы вялікую ролю мопраўскіх арганізацый у інтэрнацыянальным выхаванні працоўных, у згуртаванні мас вакол партыі і ўрада, бюро абкома КП(б)Б намеціла рад практычных мерапрыемстваў па далейшаму ўмацаванню і ажыўленню мопраўскай работы ў вобласці. Прынята пастанова аб правядзенні справаздач і выбараў кіруючых мопраўскіх арганізацый. Справаздачна-выбарчая кампанія ў пярвічных арганізацыях будзе праведзена з 20 кастрычніка па 5 лістапада. Раённыя канферэнцыі адбудуцца ў дні з 5 па 15 лістапада. Абласная канферэнцыя МОПР'а назначана на 23 лістапада.

Бюро абкома КП(б)Б прапанавала ўсім гаркомам і райкомам КП(б)Б узначаліць і правесці справаздачна-выбарчую кампанію ў мопраўскіх арганізацыях пад знакам далейшага згуртавання працоўных вобласці вакол большэвіцкай партыі і ажыццяўлення інтэрнацыянальных задач МОПР'а. У кіруючыя органы мопраўскіх арганізацый павінны прыйсці перадавыя правераныя рабочыя, сяляне і інтэлігенты - энтузіясты мопраўскай работы.

Гаркомам і райкомам партыі прапанавана пытанні аб ролі і значэнні мопраўскай работы абмеркаваць на раённых партсходах або на агульна - гарадскіх і раённых сходах партыйнага актыва, а таксама заслухаць справаздачы кіраўнікоў оргбюро МОПР'а на пасяджэннях бюро гаркомаў і райкомаў КП(б)Б.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ



У чытальні Новабарысаўскай запалкавай фабрыкі імені Кірава (Мінская вобласць). За вывучэннем гісторыі ВКП(б) інжынер-хімік З. А. Шрэйтуль (злева) і тэхнічны кіраўнік цеплаэлектрацэнтралі фабрыкі Т. Н. Мамонаў.

Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

Калі адсутнічае праверка выканання...

Адсутнасць кантролю за выкананнем партыйных рашэнняў прывяла да таго, што ў пярвічнай партыйнай арганізацыі 5-га тэкстыльнага камбіната значная частка пастаноў партыйных сходаў да гэтага часу не выканана. За ўвесь час існавання партыйнай арганізацыі прынята 10 пастаноў, з якіх праверана выкананне толькі трох.

— Я ведаю, што робіцца на камбінаце і чаму не выконваюцца тыя ці іншыя пастановы. Для чаго-ж ставіць гэта пытанне на партсходзе? — заяўляе сакратар партарганізацыі тав. Глухоўскі.

28 мая на партыйным сходзе было прынята рашэнне аб пераводзе да 5 чэрвеня будаўнічых рабочых на здзельшчыну. З таго часу прайшло больш чатырох месяцаў, а рашэнне поўнасцю не выканана. З 130 будаўнічых рабочых на здзельную аплату работы пераведзена толькі 60 чалавек.

На партыйным сходзе 9 ліпеня стаяла пытанне аб правільнай расстаноўцы рабочай сілы на камбінаце. Гэта было выклікана тым, што на камбінаце была лішняя рабочая сіла. У прынятай пастанове па гэтаму пытанню сход прапанаваў дырэктару камбіната тав. Назімаву ўрэгуліраваць пытанне з рабочай сілай, згодна плана трэцяга квартала да 25 ліпеня і 27 ліпеня далажыць партсходу аб выкананні пастановы. Але ўсё асталося толькі на паперы. Ніякай праверкі выканання пастановы партарганізацыя не рабіла.

Па пытанню падрыхтоўкі да пуску капялюшавай фабрыкі ў пастанове партыйнага схода сказана: «Абавязаць аддзел галоўнай механікі пад асабістую адказнасць галоўнага механіка тав. Трубнікава мабілізаваць тэхнічную сілу і 5 жніўня пусціць у ход фабрыку». І гэта пастанова асталася таксама нявыкананай. З 1 верасня пушчаны толькі некалькі цэхаў.

На камбінаце не было памяшкання для сталовай. Калі надвор'е спрыяла і было цёпла, яна знаходзілася на адкрытым паветры. Цяпер-жа, калі наступілі дажджы і набліжаюцца замаразкі, паўстала пытанне аб пабудове памяшкання для сталовай. Нарэшце, рашылі абсталяваць сталовую ў былым ткацкім цэху на другім паверху. Пачалі пераносіць станкі, мяняць падлогу і т. д.

Партыйны сход вынес пастанову, у якой прапанаваў закончыць пабудову сталовай да 5 кастрычніка. Але сталовая не закончана і па сённяшні дзень.

Сакратар партыйнай арганізацыі тав. Глухоўскі не палічыў патрэбным на сходзе абмеркаваць і пастанову бюро гарадскога камітэта КП(б)Б ад 4 ліпеня аб якасці выпускаемай прадукцыі тэкстыльнай прамысловасцю горада.

— Там амаль усё датычыцца тэкстыльнага трэста. Навошта ставіць гэта на нашым сходзе?—гаворыць тав. Глухоўскі.

Неабходна сістэматычна правяраць своечасовасць выканання прынятых пастаноў партыйнымі сходамі і ўказанняў гаркома партыі.

Р. Кісельман.

Сур'ёзна арганізоўваць семінары

ЗАМБРАВА. **(Па тэлефону).** Аддзел прапаганды і агітацыі Замбраўскага райкома партыі ў пачатку кастрычніка склікаў семінар кіраўнікоў агіткалектываў. Сабралося 30 кіраўнікоў агіткалектываў, сакратары пярвічных партыйных і камсамольскіх арганізацый. У план работы былі ўключаны даклады аб міжнародным становішчы, «Што дала савецкая ўлада працоўным», лекцыя «Паходжанне жыцця на зямлі» і гутарка аб задачах агіткалектываў у заходніх абласцях Беларусі.

Даклады былі прачытаны, а лекцыя і гутарка сарваліся. Райкому партыі неабходна пачатую справу давесці да канца.

І. Рудакоўскі,
прапагандыст Замбраўскага райкома партыі.

Дзейсна дапамагаць комсамолу школы

Задачы комсамольскіх арганізацый па рабоце ў школах, барацьба за выхаванне маладога пакалення выключна ясна і выразна вызначаны ў рашэннях X пленума ЦК ВЛКСМ. Кожны крок работы комсамола ў школе павінен быць пранікнут імкненнем няўтомна дапамагаць партыі выхоўваць дысцыплінаваных і пісьменных грамадзян нашай радзімы.

Там, дзе гэта зразумелі, —справа пастаўлена добра. Пацвярджэннем гэтаму служыць пастаноўка ўсёй масава-выхаваўчай работы ў 11-ай гродненскай школе. Тут комсамольцы паказваюць прыклады ў вучобе, правільнай арганізацыі пазашкольнай работы, паказваюць, як трэба сябе весці, рыхтавацца да ўрокаў.

Арганізацыя, якая налічвае 16 чалавек, пасля справаздачна-выбарчага схода па-баявому прыступіла да выканання наказа комсамольцаў. Яна стварыла моцны, працаздольны актыў з лепшай несаюзнай моладзі.

У школе нядрэнна арганізавана масавая работа. Пачалі працаваць гурткі мастацкай самадзейнасці — харавы, музыкальны. Створан школьны ансамбль песні і пляскі, рэгулярна выходзіць насценная газета. Рэдактарам яе выбран комсамолец тав. Врубін.

Такіх поспехаў комсамольская арганізацыя школы дабілася таму, што яна працавала ў цесным кантакце з настаўніцкім калектывам. Ёй аказвалася дзейсная і канкрэтная дапамога.

Значна палепшылі работу комсамольскія арганізацыі школ №№ 7, 9, 13. Хаця яны яшчэ мalалікія, але іх работа відаць на кожным кроку. Для несаюзнай моладзі, якая рыхтуецца да паступлення ў рады ленінска-сталінскага комсамола, арганізаваны і сістэматычна працуюць гурткі па вывучэнню праграмы і статута ВЛКСМ.

Вялікая работа праводзіцца і сярод піонераў. З ліку лепшых падрыхтаваных комсамольцаў вылучаны важатыя. Зборы пачалі праводзіцца весела, цікава і арганізавана.

На жаль, яшчэ не ва ўсіх школах комсамольскія арганізацыі пачалі працаваць па-новаму. Арганізацыя 1-й школы самая многалікая ў горадзе: налічвае 26 комсамольцаў. Аднак яна не здолела мабілізаваць з першых дзён вучобы ўвесь калектыў на ўмацаванне дысцыпліны, паляпшэнне паспяховасці вучняў. У школе часта нарушаюцца элементарныя правілы павагі і дысцыпліны. Комсамолец, вучань 9 класа, Мірановіч сваёй грубасцю, нетактычнасцю падрывае аўтарытэт педагогаў. Іншы раз справа даходзіць нават і да агіднасцей. Калі настаўнік пачаў указваць піонеру 7 класа Асадчанку на яго дрэнную дысцыпліну, паследаваў развязны адказ:

— У мяне няма часу з вамі гаварыць...

Такія факты ў школе не адзінічны. Іх можна назіраць амаль кожны дзень. І вельмі часта, як гэта ні дзіўна, яны праяўляюцца з боку вучняў, бацькі якіх з'яўляюцца комуністамі.

Вялікая віна за ўсе гэтыя непаладкі падае і на гарком комсамола, які як след не кіруе комсамольскімі арганізацыямі школ, не павярнуўся тварам да іх. Школьная камісія ўсё яшчэ раскачваецца, намячае планы і мерапрыемствы аб паляпшэнні работы ў школе. На справе яшчэ нічога не зроблена. А даўно ўжо час ад размоў і раскачак перайсці да канкрэтных спраў.

С. Партной.

Гродна.

Вялікі поспех платных лекцый

БЕЛАСТОК

11 кастрычніка аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома партыі ў Доме партыйнай асветы арганізаваў платную лекцыю аб міжнародным становішчы. Лекцыю чытаў лектар тав. Токараў. Поспех лекцыі быў вельмі вялікі.

ВАЎКАВЫСК


У лекцыйным зале парткабінета Ваўкавыскага райкома партыі прачытана першая платная лекцыя на тэму: «Арганізацыя Трэцяга Комуністычнага Інтэрнацыянала». Лекцыю чытала лектар абкома партыі тав. Дзенісюк. Прысутнічалі партыйныя і савецкія работнікі, інтэлігенцыя і рабочыя прадпрыемстваў горада. Лекцыя прайшла з вялікім поспехам. Тав. Дзенісюк падрабязна расказала аб стварэнні міжнароднай комуністычнай арганізацыі—Комінтэрна. Асаблівую ўвагу тав. Дзенісюк удзяліла вялікай рабоце Леніна і Сталіна па стварэнню Комінтэрна.

ГРАЕВА

Насельніцтва Граеўскага раёна праяўляе вялікі інтарэс да лекцый, якія чытаюцца ў дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю ВКП(б). Асабліва вялікай папулярнасцю карыстаюцца платныя лекцыі. На адбыўшайся днямі платнай лекцыі на тэму «Утварэнне Трэцяга Комуністычнага Інтэрнацыянала» прысутнічала 100 чалавек. Усяго за апошні час у Граеве прачытана 7 лекцый. На іх прысутнічала каля 500 чалавек.

САКОЛКА

Днямі Саколкаўскі райком партыі арганізаваў платную лекцыю на тэму «Апошнія міжнародныя падзеі». На лекцыі прысутнічала 250 чалавек. Сюды прышлі настаўнікі, рабочыя, члены арцелі, хатнія гаспадыні. Лекцыя была выслухана з вялікай увагай. Лектару было задана многа пытанняў, на якія ён даў падрабязныя адказы.



Беластоцкі вацінна-ватны камбінат № 32 створан з 12 дробных фабрык. Выпуск прадукцыі камбіната павялічыўся амаль у 10 разоў. На здымку: у новым ткацкім цэху камбіната.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА.

ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ XXIII ГАДАВІНУ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

Рыхтуюць дастойную сустрэчу

ВАЎКАВЫСК. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Сярод калектыва рабочых Ваўкавыскага паравознага дэпо з кожным днём шырацца рады майстраў соцыялістычнай працы — стаханаўцаў. У верасні 257 машыністаў, слесараў, токараў і кацельшчыкаў значна перавыканалі свае вытворчыя заданні. Лепшы токар дэпо, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР Сцяпан Крук у верасні даў 114 процантаў плана. Працуючы на стругальным станку, Марыя Ёрш выканала план на 134 проценты. Слесар цэха прамыўкі Саламон Бекер выканаў заданне на 145 процантаў, кацельшчык тав. Некрасаў — на 125, аўтаматчык тав. Маскаленка — 133 проценты. Машыніст Владзімір Ірко не мае ні аднаго спазнення пасажырскага поезда.

Увесь механічны цэх майстра тав. Дабычына выканаў месячную праграму ў верасні на 135 процантаў.

Рыхтуючыся да слаўнай гадавіны Вялікага Кастрычніка, паравозныя брыгады машыністаў Туручэнкі і Грамакова абавязаліся рабіць з грузам прабег на сваім паравозе 6 тысяч кілометраў без міжпрамыўнага рамонту замест нормы 2.200 кілометраў. Такое-ж абавязацельства ўзялі на сябе паравозныя брыгады тт. Мухіна і Выжыенка. Узятыя абавязацельствы паспяхова выконваюцца.

Д. Казлоў.

Рыхтуюцца да свята

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Тут створана раённая камісія па падрыхтоўцы да правядзення святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

45 агітатараў і прапагандыстаў выязджаюць у сельсоветы для правядзення работы.

У вёсках будуць падведзены вынікі соцыялістычнага спаборніцтва ў справе заканчэння асенніх сельскагаспадарчых работ. У раённым цэнтры намечана арганізаваць да свята выстаўку, якая адлюструе поспехі СССР за 23 годы.

В. Гарбанёў.

ЗАКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ

ГРОДНА. **(Па тэлелефону ад нашага карэспандэнта).** Рыхтуючыся да ўсенароднага свята — XXIII гадавіны Вялікага Кастрычніка, калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Першага Мая, Індурскага пасялковага совета, першымі ў раёне закончылі ўборку бульбы. Калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па абавязковых пастаўках збожжа, бульбы і грашовых плацяжах. Калгаснікі таксама выканалі свае абавязацельствы па здачы бульбы дзяржаве.

Зараз па-ўдарнаму ідзе малацьба, ворыва зябліва, пераворванне бульбянішча. Калгаснікі абавязаліся да 20 кастрычніка закончыць малацьбу і ворыва зябліва.

У калгасе рыхтуюцца да размеркавання ўраджаю. Пры канчатковым размеркаванні калгаснікі атрымаюць на кожны працадзень па 2 кілограмы збожжа, 8 рублёў грашыма і многа іншых прадуктаў.

Пры сельсовеце адбылася нарада, на якой прысутнічала 150 чалавек. Удзельнікі нарады ўзялі на сябе абавязацельства да 20 кастрычніка поўнасцю выканаць план бульбапаставак па аднаасобнаму сектару і да 25 кастрычніка ўнесці грошы на пазыку Трэцяй пяцігодкі.

Г. Лупсякоў.

Поспехі членаў арцелі „Праца"

Члены Аўгустоўскай смалакурнай арцелі «Праца» спаборнічаюць паміж сабой за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Верасснёўскі план па вырабу смалы выканан на 380 процантаў, скіпідару — на 130 процантаў, калёснай мазі — на 192 проценты.

З кожным днём усё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу ўсенароднага свята.

Дзмітрый Іванавіч Пісараў

(Да стагоддзя з дня нараджэння)

Росквіт рускай літаратурнай крытыкі быў звязан з паяўленнем на грамадскай арэне ідэолагаў спеючай рэволюцыйнай дэмакратыі. Белінскі, Герцэн, Чэрнышэўскі і Дабралюбаў ператварылі крытыку ў магучую зброю і эстэтычнага і палітычнага выхавання мас. Яны накіравалі асноўны паток рускай класічнай літаратуры ў рэчышча рэалізма.

Да гэтай-жа слаўнай пляяды належаў і Дзмітрый Іванавіч Пісараў, славуты рускі крытык і публіцыст, які пачаў і закончыў сваю дзейнасць у 60 годах мінулага века.

Шасцідзесятыя гады — вельмі важная эпоха ў гісторыі грамадскага руху ў Расіі. Паражэнне царызма ў Крымскай вайне 1855 года паказала ўсім, што самаўладства і прыгонніцтва перажылі саміх сябе і ператварыліся ў галоўнейшую перашкоду для развіцця краіны. Сам урад вымушан быў з страху перад рэволюцыяй стаць на шлях рэформ, з якіх самай галоўнай было «вызваленне» сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак самаўладства, прыступіўшы да рэформ, зусім не думала аб задаволенні народных патрэб. Мэта рэформ заключалася ў тым, каб невялікімі падачкамі, па магчымасці чыста вонкавымі фармальнымі зменненнямі ў старых адносінах, ашукаць незадаволеных, захаваўшы і ў новых умовах некрануты самаўладства і прывілегіраванае становішча дваранства. І пасля сялянскай рэформы ў вёсцы захаваліся ў абшырным маштабе прыгонніцкія перажыткі, пануючае становішча памешчыкаў.

У сялянства не было тады сіл, каб скінуць самадзяржаўе і памешчыкаў рэволюцыйным шляхам. Пролетарыят у Расіі 60-х гадоў знаходзіўся яшчэ на самых першапачатковых ступенях свайго развіцця. Сялянства, якое не кіравалася рэволюцыйным класам з горада, забітае вякамі рабства, яшчэ не валодала палітычнай свядомасцю і таму не разбіралася дастаткова ясна ў сваім становішчы, хвалявалася, але не пайшло далей адзінкавых, раздробленых паўстанняў і бунтаў. Аднак, указвае Ленін, «былі і тады ўжо ў Расіі рэволюцыянеры, якія стаялі на баку сялянства і разумелі ўсю вузасць, усё ўбоства праславутай «сялянскай рэформы», увесь яе прыгонніцкі характар. На чале гэтых, надзвычайна нешматлікіх тады, рэволюцыянераў стаяў Н. Г. Чэрнышэўскі» (Ленін, том XV, стар. 143).

Гэтыя рэволюцыянеры хацелі знішчыць самаўладства, адабраць зямлю ў памешчыкаў, зрабіць пераўтварэнне Расіі ў карысць народа, сялян, дэмакратычных нізоў. Урад Аляксандра II люта распраўляўся з лепшымі прадстаўнікамі мыслячай Расіі. У 1862 годзе ён арыштаваў Чэрнышэўскага і рад яго спадвіжнікаў. Лепшыя журналы эпохі — «Современник» і «Русское слово» былі закрыты. У ліку падпаўшых праследванням з боку



царызма быў і Д. І. Пісараў, малады публіцыст і крытык.

Зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць, Пісараў працягваў сваю літаратурную дзейнасць. З велізарнай сілай гучэў яго голас з сцен царскага казэмата. Кожны новы яго артыкул з усё большай сілай клікаў да праўды і справядлівасці.

У гэтыя годы, калі руская літаратура ўжо не мела Дабралюбава, калі царызм затачыў Чэрнышэўскага і вымусіў яго да маўчання, Пісараў граміў мракабесаў і рэакцыянераў, заняўшы першае месца ў перадавой рускай публіцыстыцы і крытыцы.

Д. І. Пісараў нарадзіўся 14 (2) кастрычніка 1840 года, у сяле Знаменскім, Орлоўскай губерні. Ён вучыўся першапачаткова ў адной з пецербургскіх гімназій, пасля сканчэння якой у 1856 годзе паступіў у Пецербургскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Пачатак літаратурнай дзейнасці Пісарава адносіцца да 1858 года, калі ён стаў супрацоўнічаць у бібліяграфічным аддзеле «Рассвета», «Журнала для дарослых дзяўчат». Зразумела, што растучаму і мацнеючаму публіцыстычнаму дараванню Пісарава рамкі «Рассвета» вельмі скора аказаліся цеснымі. Па сканчэнні універсітэта Пісараў стаў пастаянным супрацоўнікам журнала «Русское слово». Дзякуючы Пісараву «Русское слово» ператварылася ў адзін з самых перадавых, найбольш папулярных і ўплывовых рускіх журналаў.

Калі царскі ўрад прыпыніў выхад «Русского слова», Пісараў напісаў для падпольнай друкарні студэнта Балода разбор пасквіляў супроць Герцэна, аўтарам якіх быў наёмны агент царскага ўрада барон Фіркс. Артыкул Пісарава быў сапраўднай рэволюцыйнай пракламацыяй. Ён змяшчаў прамы заклік да насільнага звяржэння самаўладства. «Нізвяржэнне шчасліва царствуючай дынастыі Раманавых,—пісаў Пісараў, —і змяненне палітычнага і грамадскага ладу складаюць адзіную мэту і надзею ўсіх чэсных грамадзян. Каб пры цяперашнім становішчы спраў не жадаць рэволюцыі, трэба быць або зусім абмежаваным, або зусім падкупленым у карысць царствуючага зла».

Дзейнасць Пісарава як літаратурнага крытыка вызначалася яго соцыяльна-палітычнымі і філасофскімі поглядамі. Эстэтыка Пісарава насіла матэрыялістычны характар. Яна была прасякнута гістарызмам. Пісараў вёў упорную барацьбу супроць абстрактнага антыгістарычнага ідэалізма ў пытаннях літаратуры і мастацтва. Ён даказваў, што вечных, нязменных законаў прыгожага не існуе, што законы мастацтва з'яўляюцца вытворнымі ад сапраўднага жыцця. Як староннік грамадзянскага назначэння літаратуры Пісараў лічыў змест мастацкага твора больш істотным, чым яго форму. Ён даказваў, што форма мае значэнне як спосаб выражэння зместу. «Мне здаецца, што ў вершах, як і ў прозе, перш за ўсё патрэбна думка»,—пісаў ён.

У сваіх артыкулах Пісараў узяў пад крытычны разбор творы Пісемскага, Тургенева, Ганчарова, Гейне, Шчэдрына, Дастаеўскага, Талстога, Пушкіна. Як вядома, Пісараў адмаўляў значэнне творчасці Пушкіна, прабаваў даказаць, што мастацтва бескарысна для грамадскага жыцця. Пісараў памыляўся, але памылкі яго тлумачацца ўмовамі грамадскай барацьбы таго часу.

Лібералы абаранялі лозунг чыстага мастацтва. У якасці доказу незалежнасці мастацтва ад злобы дня, ад палітыкі яны прыводзілі творчасць Пушкіна. Біяграфія Пушкіна ў часы Пісарава яшчэ не была як трэба вывучана. Непасрэдна рэволюцыйныя месцы ў творах Пушкіна былі пад цэнзурнай забаронай і ўтоены ад даследчыкаў і чытачоў. Таму Пісараў, каб абвергнуць сваіх праціўнікаў-лібералаў, староннікаў мастацтва для мастацтва, стаў зусім адмаўляць значэнне Пушкіна. Пісараў быў няправы, але яшчэ больш няправыя былі тыя ілжывыя гісторыкі, якія ператваралі Пушкіна нібыта ў пакорнага служку цара.

Пісараў быў глыбока аддады народу і радзіме. Ён марыў аб велічы Расіі як дзяржавы і аб шчаслівым жыцці працоўных мас. Рад яго артыкулаў напісаны пад уплывам ідэй утапічнага соцыялізма.

Па сведчанню Н. К. Крупскай, Ленін добра ведаў і любіў творы Пісарава. У артыкуле «Што рабіць?», громячы меншавіцкіх ныцікаў і малавераў, якія не ўяўлялі сабе перамогі рэволюцыі ў Расіі, Владзімір Ільіч успамінаў Пісарава, яго думкі аб сувязях паміж марай і рэчаіснасцю.

Пісараў памёр у 1868 годзе, калі яму яшчэ не было 28 год. Ён пражыў усяго толькі паўтара года пасля таго, як вышаў з Петрапаўлаўскай крэпасці.

В. Кірпоцін.

ЗА РУБЯЖОМ

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 14 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «Удзень і ўноч злучэнні лёгкіх і цяжкіх бамбардыроўшчыкаў працягваюць з вялікай эфектыўнасцю бамбардыраваць Лондан і іншыя важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі.

У Лондане і перш за ўсё паўночнее Тэмзы каля Вест Індскіх докаў, а таксама каля докаў Вікторыі ўзніклі вялікія пажары. Пасля налёту на адну электрастанцыю былі заўважаны высокія стаўбы полымя і воблакі дыму.

Другі буйны налёт быў зроблен на партовыя збудаванні і ваенныя заводы Ліверпуля. Скінутыя бомбы выклікалі моцныя ўзрывы і пажары. Пры бамбардыроўцы розных ваенных аб'ектаў у Цэнтральнай і Паўднёвай Англіі былі разбураны сховішчы ў двух ваенных лагерах.

Ля вусця Тэмзы адзін германскі самалёт на невялікай вышыні абстраляў з кулямётаў караван праціўніка з 18 узброеных гандлёвых суднаў, шэдшых пад моцным канвоем. На адным з суднаў узнік пажар.

У розных месцах адбываліся паспяховыя для нас паветраныя баі.

На захад ад Кадзікса германскі бамбардыроўшчык дальняга дзеяння знішчыў узброены гандлёвы параход праціўніка танажам ад 3 да 4 тысяч тон.

Удзень праціўнік не прадпрымаў налётаў на тэрыторыю Германіі і акупіраваных абласцей. Уночы самалёты праціўніка з'явіліся над Паўночнай і Заходняй Германіяй. Бомбы, скінутыя без плана, прычынілі толькі нязначныя страты жылым дамам, не пашкодзіўшы аб'ектаў ваеннага значэння. Учора праціўнік страціў 13 самалётаў. Германская авіяцыя страціла адзін самалёт.

БЕРЛІН, 14 кастрычніка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро паведамляе, што за апошнія 24 гадзіны германскія самалёты скінулі над Лонданам, Ліверпулям і іншымі гарадамі Паўднёвай Англіі 350 тысяч кілаграмаў бомб. За гэты-ж час англійская авіяцыя скінула над Германіяй і занятымі ёю абласцямі ад 6 да 8 тысяч кілаграмаў бомб.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 14 кастрычніка. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 13-е англійская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты ў Берліне. У горадзе ўспыхнулі вялікія пажары. Асабліва моцнай бамбардыроўцы падверглася цэнтральная электрастанцыя. Акрамя таго былі бамбардыраваны заводы Крупа ў Эсене. Адзначаны прамыя пападанні. Частка бомб была выключна вялікага калібра і ўпершыню прымянялася англійскай авіяцыяй пры налётах на Германію. Бамбардыроўцы падверглісся нафтаперагонныя і нафтаачышчальныя заводы ў Гановеры і Кельне. На ўсіх гэтых заводах узніклі пажары. Запальваючыя бомбы папалі на два вялікіх прамысловых прадпрыемствы ў раёне Гама. Акрамя таго зарэгістрыраваны ўзрывы бомб у цэнтры мясцовых пражэктарных батарэй. Былі бамбардыраваны адзін з шасейных мастоў ля Брэмена, мост праз раку паблізу Ганновера, адна з пасадачных пляцовак паблізу Кельна, розныя збудаванні на аэрадроме ў Ротэрдаме і аэрадром у Гале. У выніку прамых пападанняў бомб на авіяцыйны завод Фокера ў Амстэрдаме там узніклі ўзрывы. Бамбардыроўцы падверглісся доменныя печы металургічных заводаў у Торгаў, сілавая станцыя ў Вальдэкек, якая снабжае энергіяй большую частку прамысловых прадпрыемстваў, размешчаных у даліне ракі Фульды, таксама горад Касель. Зроблены налёты на докі Кале, Булоні, Гаўра, Дзюнкерка, а таксама на судны, якія знаходзіліся ў раёне гэтых партоў. Англійскія самалёты падверглі кулямётнаму абстрэлу германскія дальнабойныя гарматы на мысе Гры Нэ.

ЛОНДАН, 14 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 14-е германская авіяцыя зрабіла налёты на абшырныя тэрыторыі Англіі. Бамбардыроўцы падвергліся 36 лонданскіх раёнаў і 20 раёнаў у правінцыі. Лондан па-ранейшаму служыў галоўным аб'ектам налётаў. У Лондане і ваколіцах пашкоджаны жылыя дамы, гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы. Падрабязны адчот аб колькасці афяр яшчэ не атрыман, аднак мяркуюць, што лічба будзе большай, чым у час папярэдніх начных атак. Бомбы былі скінуты ў некаторых пунктах графстваў Мідлсекс, Кент, Сарэй і Эсекс, аднак па атрыманых звестках толькі ў нямногіх пунктах ёсць пашкоджанні і невялікая колькасць афяр.

Выступленне Рузвельта

НЬЮ-ЙОРК, 13 кастрычніка. (ТАСС). У сувязі з гадавінай адкрыцця Калумбам Амерыкі Рузвельт выступіў у Дэйтоне (штат Огайо) з прамовай, якая трансліравалася па радыё ва ўсе краіны Лацінскай Амерыкі. Рузвельт, у прыватнасці, заявіў:

ЗША мабілізуюць людзей і рэсурсы і ўзбройваюцца не толькі для абароны сваёй уласнай краіны, але і для таго, каб у супрацоўніцтве з іншымі амерыканскімі рэспублікамі дапамагчы абароне ўсяго Заходняга поўшар'я. Мы ствараем усеахапляючую абарону на сухазем'і, на моры і ў паветры, дастатковую для таго, каб адбіць напад з любой часткі свету. ЗША, сказаў Рузвельт, упершыню ў сваёй гісторыі прыступілі да мабілізацыі сваіх людзей у мірны час. Узнікненне беспрэцэдэнтнай небяспекі пабудзіла ЗША прыступіць да стварэння такога ваенна-марскога флота і такой авіяцыі, якія былі-б дастатковымі для абароны ўсіх берагоў Амерыкі ад любой камбінацыі варожых дзяржаў.

Далей Рузвельт сказаў: ніякая камбінацыя варожых краін Еўропы і Азіі не зверне нас з таго шляху, які мы лічым найбольш прыемлемым для сябе, і не прыпыніць той дапамогі, якую мы аказваем Англіі. Наш курс ясны. Наша рашэнне прынята. Мы будзем і ў далейшым умацняць сваю абарону і павялічваць свае ўзбраенні. Ні адзін амерыканец у любой частцы амерыканскага кантынента, заявіў Рузвельт, не павінен сумнявацца ў магчымай небяспецы, якая пагражае з-за акіяна. Мы ведаем, што калі мы спрабуем уміратварыць «злыя сілы», якія схільны да заваявання ўсяго свету, стрымліваючыся ад аказання дапамогі тым, хто стаіць на іх шляху, то мы толькі паскорым набліжэнне таго дня, калі яны нападуць на нас. Народ ЗША і народы ўсёй астатняй Амерыкі абвяргаюць дактрыну ўміратварэння. Яны разумеюць, што гэтая дактрына прадстаўляе сабою важнейшую зброю агрэсіўных краін.

Калі мы гаворым аб абароне Заходняга поўшар'я, сказаў далей Рузвельт, мы маем на ўвазе не толькі тэрыторыю Паўночнай, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі і прылягаючых да іх астравоў. Мы ўключаем сюды таксама права мірна карыстацца Атлантычным і Ціхім акіянамі. Такая была ў мінулым наша традыцыйная палітыка. Мы ў Амерыцы па-ранейшаму лічым, што абарона гэтых акіянаў Заходняга поўшар'я супроць актаў агрэсіі прадстаўляе сабой першаступенны фактар у абароне і ахове нашай уласнай тэрытарыяльнай цэласнасці. Мы зноў пацвярджаем гэту палітыку, каб не было ніякіх сумненняў адносна нашых намераў падтрымліваць яе. У кожнай з 21 амерыканскай рэспублікі маюцца асобы, якія лічаць, што курс, якога прытрымліваюцца амерыканскія краіны, паступова ўцягвае адну або ўсе краіны ў вайну з якой-небудзь іншай краінай ці краінамі, размешчанымі па другі бок акіянаў. Ужо неаднаразова і зусім ясна было заяўлена, што наша краіна не жадае ваяваць з якой-небудзь іншай краінай. Заходняе поўшар'е не хоча ваяваць ні з якой краінай. Амерыканскія рэспублікі поўны рашымасці супрацоўнічаць у справе забеспячэння міру таксама, як мы сумесна супрацоўнічаем па стварэнню сваёй абароны супроць нападу.



Група пісьменнікаў і паэтаў Беластока, прынятых нядаўна ў Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР. Фота А. Сапіра.

ВЫРАБ АГНЯСТОЙКАЙ ЦЭГЛЫ

ГРОДНА. (ад нашага карэспандэнта). Агнястойкая цэгла — гэта дэфіцытны будаўнічы матэрыял. Пры будаўніцтве другой ваннай печы і рамонце дзейнічаючай старой печы гродненскаму шклозаводу спатрэбілася такая цэгла. У разнарадку-ж на атрыманне гэтага дэфіцытнага матэрыялу завод яшчэ не ўнесен.

Па прапанове старога рабочага тав. Галаўня агнястойкую цэглу пачалі выраблять на месцы.

Пры заводзе абсталяван спецыяльны цэх. Агнястойкая гліна завезена з Сталінска, тутэйшыя белы пясок з Росі. Цэх і ў далейшым будзе працягваць сваю работу. Ён забяспечыць завод гэтым дэфіцытным матэрыялам.

Навуковая сесія Акадэміі навук БССР у Беластоку закончыла работу

13 кастрычніка працягвала сваю работу навуковая сесія Акадэміі навук БССР у Беластоку. Як і ў дзень адкрыцця сесіі, зала была перапоўнена прадстаўнікамі інтэлігенцыі і рабочых прадпрыемстваў.

З разгорнутым дакладам на тэму: «Навука сталінскай эпохі» выступіў акадэмік С. Я. Вальфсон. З цікавасцю слухалі прысутныя аб самай перадавой у свеце совецкай навуцы, якая практычна вырашае пытанні соцыялістычнага будаўніцтва, далейшага ўмацавання абароннай магутнасці нашай радзімы.

Пасля перапынку слова для даклада на тэму: «Першыя вынікі ўздыму гаспадарчага і культурнага ўзроўню заходніх абласцей БССР і задачы эканамічнага вывучэння гэтых абласцей» — прадастаўляецца прафесару Я. Г. Ракаву. Даклад з'явіўся адным з найбольш цікавых і быў выслухан з вялікай увагай.

Тав. Ракаў паведаміў, што ў галіне прамысловасці будуць вырашаны праблемы правільнага размяшчэння занава ствараемых прадпрыемстваў і набліжэння іх да крыніц сыравіны і месца спажывання. Будуць створаны новыя паліўныя базы, расшырана сетка электрастанцый з пераводам іх на мясцовае паліва. Будаўніцтва новых электрастанцый будзе ўвязана з генеральным планам электрафікацыі БССР.

Спыняючыся на пытаннях сельскай гаспадаркі, дакладчык паведаміў, што пры спецыялізацыі па сельскай гаспадарцы раёнаў будзе звернута асаблівая ўвага развіццю тэхнічных культур, развіццю аўцагадоўлі для стварэння магутнай сыравіннай базы для тэкстыльнай прамысловасці.

Кандыдат філалагічных навук В. В. Барысенка зрабіў яркі даклад «Адлюстраванне ў мастацкай літаратуры і народнай творчасці вызвалення Заходняй Беларусі».

Народ, паэты і пісьменнікі ў вершах, навелах уславілі дзень 17 верасня 1939 года, як вялікі гістарычны дзень. Навекі знішчана несправядлівасць. У вершах і песнях асабліва ўслаўлена гераічная Чырвоная Армія—вызваліцельніца народа. Доўгія годы народ Заходняй Беларусі марыў аб сваім вызваленні. Гэта народная мара ярка адлюстравана ў вершах паэтаў Філіпа Пестрака, Максіма Танка, Іверса, Соф'і Лісоўскай і іншых.

У гэты-ж дзень на сесіі Акадэміі навук заслуханы даклады акадэміка О. К. Кедрава-Зіхмана: «Асноўныя дасягненні ў галіне хімізацыі соцыялістычнага земляробства ў СССР» і акадэміка А. Р. Жэбрака—«Важнейшыя рэзультаты селекцыйна-генетычных работ у СССР».

Работа навуковай сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку ператварылася ў сапраўднае свята працоўных вобласці.

Ткачы, дрэваапрацоўшчыкі, калгаснікі раду сельскагаспадарчых арцелей вобласці знаёміліся з дасягненнямі вучоных краіны соцыялізма.

Выключна цікавай была сустрэча акадэміка В. Н. Лубяка, члена-карэспандэнта акадэміі навук Н. Г. Чыжэўскага з калгаснікамі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, Заблудаўскага раёна. Былыя беднякі расказалі вучоным аб сваіх поспехах, аб вялікім ураджаі, аб тым, што іх жыццё стала радасным і шчаслівым.

Пасля азнаямлення з гаспадаркай калгаса, наведвання брыгад і асобных звенняў вучоныя расказалі калгаснікам аб стаханаўскіх метадах барацьбы за сталінскі ўраджай, аб шляхах павелічэння таварнасці і расшырэння грашовых даходаў за кошт развіцця жывёлагадоўлі.

14 кастрычніка на сесіі заслуханы даклады акадэміка Ю. А. Вейса «Развіццё механізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР» і члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР М. Г. Чыжэўскага — «Вучэнне акадэміка Вільямса аб траваполнай сістэме земляробства».

Сесію вітала дэлегацыя стаханаўцаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі г. Беластока.

На гэтым навуковая сесія Акадэміі навук БССР закончыла сваю работу.

Прывітанне ад Акадэміі навук СССР

Беласток, Сесіі Акадэміі навук БССР, прысвечанай першай гадавіне з'еднання беларускага народа

Акадэмія навук Совецкага Саюза горача вітае працоўных Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі з першай гадавінай вызвалення адзінакроўных братоў—заходніх беларусаў з-пад капіталістычнага гнёту.

Дзякуючы сталінскай мудрай палітыцы міру совецкі народ і яго вучоныя маюць магчымасць займацца мірнай працай. Совецкія вучоныя з усім совецкім народам памятаюць аб капіталістычным акружэнні і зробяць усё магчымае для ўзмацнення абароназдольнасці нашай вялікай радзімы.

Акадэмія навук Совецкага Саюза горача вітае беларускіх вучоных разам з працоўнымі Беларускай рэспублікі, працуючых над узмацненнем магутнасці заходніх фарпостаў краіны соцыялізма.

Няхай жыве з'еднаны беларускі народ!

Няхай жыве вялікі совецкі народ!

Няхай жыве глава совецкага ўрада таварыш Молатаў!

Няхай жыве сцяг нашых перамог—таварыш Сталін!

Прэзідэнт Усесаюзнай Акадэміі навук акадэмік КАМАРОЎ.

Віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук СССР акадэмік ШМІДТ.

Акадэмік ЧУДАКОЎ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Сёння, 15 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у зале беластоцкага Дома партасветы (вуліца Талстога, 9) будзе прачытана лекцыя на тэму **«Інтэлігенцыя і соцыялізм».**

Лекцыю чытае акадэмік **Вальфсон.**

Уваход платны. Білеты прадаюцца ў бібліятэцы Дома партасветы. Цана білета 1 рубель.

Аддзел Прапаганды і Агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Нам. адказнага рэдактара

Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

УБ. — 70.

Друкарня Беластокдрук.